Тарасава, Т.М. Сыс Анатоль / Т.М. Тарасава // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы, Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А.В. Мальдзіса ; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Т. 5. – С. 466.

# СЫС АНАТОЛЬ



Сыс Анатоль Ціханавіч (псеўд. Т о л і к Г а н а р а р; 26.10.1959, в. Гарошкаў Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), паэт. Член СП Беларусі з 1988.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З 1967 вучыўся ў мясцовай пачатковай школе, потым у суседняй вёсцы Броннае, дзе ў 1977 скончыў 10 класаў. З 1977 да 1982 вучыўся на аддзяленні рускай і беларускай мовы і літаратуры Гомельскага дзярж. універсітэта. Пасля заканчэння універсітэта прызваны ў Армію (служыў на тэрыторыі Польшчы). У 1984 працаваў карэспандэнтам раённай газеты «Перамога Кастрычніка» ў г. Ветка. У 1985 пераехаў у Мінск, дзе працуе старшым тэхнікам Рэспубліканскага радыётэлецэнтра.

Друкавацца пачаў яшчэ падчас вучобы ў школе ў раённай газеце «Дняпровец». У гады вучобы ва ўніверсітэце зрэдку дасылаў паэтычныя творы ў «Гомельскую праўду», «Чырвоную змену». Рэгулярна друкуецца з 1986. Першы самастойны зборнік «Агмень» (бібліятэка час. «Маладосць») выйшаў у свет у 1988, куды ўвайшлі вершы і дзве паэмы, напісаныя ў час знаходжання ў войску. Усё, што напісана да службы ў войску, паэт спаліў. У студэнцкія гады пісаў пародыі на сяброў і часта дэкламаваў іх на вечарынках. У 1989 надрукаваны зборнік «Пан Лес». А. Сыс — паэт шчыры, адкрыты, эмацыянальны, патрабавальны да свайго паэтычнага радка, не цярпіць пустазвону і шэрасці ў паэзіі. Тэма асабістага «я» ў кантэксце сучаснага адраджэння — найбольш блізкая і актуальная ў паэта. У яго балюча абвостраны погляд на сучаснасць, дапытлівы пошук выйсця са складанага становішча, у якім апынулася беларуская культура ў апошні час. Штодзённая карпатлівая і бязлітасная праца душы накіравана на пошук новых літаратурных форм і нетрадыцыйнага самавыяўлення. Апошні час ён піша мала. Адчувае ўнутраную патрэбу і заклік часу заняцца перакладамі, асэнсаваць беларускую літаратуру ў святле сусветнай літаратуры.

Жыве ў Мінску.

*Т. М. Тарасава.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ